Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12—6** (Wileńska 12, m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 5 — Вільня, Субота 15-га верасьня 1928 г. — Год 1

Чарговы падарунак.

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб тэй мове,
Якой азваўся беларус?

Я. Купала.

Усьлед за апячатаньнем і „адпячатаньнем“ памяшчэньня Галоўнае Управы Таварыства Беларускае Школы ў Вільні, беларускае грамадзянства стала перад фактам зачыненьня беларускае гімназіі ў Радашковічах.

Яшчэ новы ўдар па культурнаму адраджэньню беларускага працоўнага люду прыходзіцца нам перанесьці, яшчэ з новым доказам „толераваньня“ беларускага школьніцтва з боку Крэсавай Адміністрацыі прыходзіцца нам спаткацца.

Дзе тыя абяцанкі-цацанкі рэгіяналістаў, якія так усьцешылі нашых „спадароў“ і іншых збанкрутаваўшых у вачох беларускага працоўнага народу „дзеячоў“?

Каму гэта патрэбна і якой такія „падарункі“ дасягаюць мэты?

Беларускае адраджэньне ня толькі на ніве палітычнай, але і культурна-асьвятовай з даўных часоў шло шляхам змаганьня. Пакуль яно было ў зародку, пакуль беларускія працоўныя гушчы не праяўлялі актыўнасьці, здавалася, што досыць будзе гэту масу ўскалыхнуць як:

К свабодзе, роўнасьці і знаньню
Мы працярэбім сабе сьлед!
І будзе ўнукаў панаваньне
Там, дзе сягоньня плача дзед!

Паўстала (цяпер нябошчыца) „Грамада“, маса ўскалыхнулася, маса зразумела, што заўтрашні лепшы дзень запежыць ад арганізаванасьці іх самых,—Грамады няма. Ахвяры за цяжкія для маладога беларускага арганізму. Маса скіравала сваю вякамі дрэмлючую энэргію на культурна-асьвятовую працу. Беларускі працоўны народ зразумеў, што перамога ў змаганьні заўсёды пераходзіць на бок змагара, сільнейшага культурай, ведай і навукай. Сам галодны, абцяжараны падаткамі, селянін і работнік знаходзіў магчымасьць пасылаць сваіх дзяцей у школы за ведай. Якая-ж школа можа лепш адукаваць вучня, калі ня яго родная, блізкая яго сэрцу!

Вось і Радашкоўская Беларуская Гімназія была той школай, дзе вучыліся дзеці ад плуга і станка, вучыліся ў роднай мове, каб потым ісьці да свайго сярмяжнага люду і нясьці ім сьвет сярод цёмнае ночы, што пануе над нашай старонкай.

Цяпер зразумела, што за прычыны закрыцьця Радашкоўскае Гімназіі?

Ці ня мыляцца „паны палажэньня“? Ці ўдасца ім спыніць нашу культурную працу?

Працоўны беларускі народ са шляху змаганьня за свае палітычныя, эканамічныя і культурныя правы ня сойдзе, бо ён ужо ведае, што трэба рабіць...

„Гусарская атака“ на Нямеччыну, ці—„пацыфічная“ прамова Брыяна ў Лізе Нацыяў.

Як можна было згары спадзявацца, прыпёрты да муру нямецкім дамаганьнем скасаваньня акупацыі, якая страціла ўсялякія праўныя і маральныя падставы, Брыян павінен быў — або ўступіць давадам і прапазіцыям немцаў, або, жадаючы захаваць акупацыю надалей, рашуча папсаваць з імі стасункі станоўчай адмовай. Але не дарма-ж Францыя—у рэзультаце паразуменьня з Англіяй — атрымала ад апошняй вольную руку ў Эўропе, — поўнае падтрыманьне згары для францускай палітыкі на кантынэньце. За важныя ўступкі з боку Францыі на моры Англія перастала зусім націскаць на Францыю і ў яе „нямецкай палітыцы“. Гэта адразу адчулі на сабе немцы ў Жэнэве. Спрытны Штрэзэман прадбачыў такі паварот справы француска-нямецкіх стасункаў на бліжэйшы час і пастанавіў у першы раз за ўсю сваю дыпляматычную кар'еру астацца ў часе сэсіі Лігі дома — „захварэўшы“ на гэты час.

Прадбачаньні спрытнага дыплёмата зьдзейсьніліся цалком. Прамова, якую Брыян сказаў 10 верасьня на Агульным Зборы Лігі, разьбівае, як цьвердзіць нямецкая прэса, усё, што зроблена за ўвесь час для паправы француска-нямецкіх стасункаў супольнымі высілкамі эўрапэйскай дыплёматыі.

Падаём зьмест гэтай прамовы, паводле „П. А. Т.“, якое, нажаль, падала прамову Брыяна ў такім „скароце“, што цяжка зразумець тое страшэннае абурэньне, якое выклікала яна ў Нямеччыне.

„Пасьля гучных камплімэнтаў Лізе Нацыяў, якая ўсьцяж, як нейкая дабрадзейная фэя, спыняе ўсе спрэчкі, сваркі і канфлікты, пагражаючыя вайной, спыняе навет выбухнуўшую ўжо вайну, Брыян сцьвярдзіў, што шлях міру яшчэ, нажаль, завалены вялікімі перашкодамі, якія з вялікім трудам павінны яшчэ быць адкінуты на бок. Дзеля таго ня можна яшчэ навет мысьліць аб скасаваньні ўсялякіх збраеньняў на сушы, на моры і ў паветры... Некаторыя дзяржавы, не належачыя да Лігі Нацыяў, усьцяж павялічваюць свае збраеньні (пэўне-ж ківок у бок СССР. А ці— дзяржавы, належачыя да Лігі, не павялічваюць усьцяж сваіх збраеньняў на сушы, на моры і ў паветры)?!... Нямеччына, праўда, мае кадровую армію толькі ў 100 тысячаў. Але, апроч таго, Нямеччына мае вялізарную колькасьць сільных мужчын, якія могуць быць у любы мамэнт азброены да зубоў. Нямеччына такім чынам мае вялізарнай сілы „ваенны потэнцыял“ (ваенныя магчымасьці, гатовыя рэзэрвы) — ня толькі ў людзях, атрымаўшых ваеннае падрыхтаваньне ў школах і спортавых таварыствах, у кадрах Рэйхсвэру, якія могуць служыць падставай для шпаркага стварэньня вялізарнай арміі, але і ў высокай разьвітай прамысловасьці. Нямецкія запасы ваеннага матэрыялу, праўда, былі зьніштожаны пасьля міру, але Нямеччына можа—дзякуючы сваей прамысловасьці — у нябывала шпаркім тэмпе ў любы мамэнт аднавіць усе гэты запасы збраеньняў. Усё гэта — чыньнікі, якія не дазваляюць залішне сьпяшыцца з абмяжаваньнем збраеньняў... Пасьля гэтага Брыян гучна славіў „мірную волю народаў“, якая ўсьцяж робіць поступы, дабіўшыся таго, што даваенныя „выперадкі ў збраеньнях“ — цяпер спыніліся. (Нешта ня відаць гэтага, прынамсь у лягеры „пераможцаў“—з Амэрыкай на чале, якая перад вайной якраз ня прыймала ў гэтым учасьця)...

Усе гэта выразна было скіравана Брыянам проці Нямеччыны—ў адказ да прамову канцлера Мюллера, які спакойна, але рашуча, паставіў перад Лігай нямецкае дамаганьне роўнасьці ўсіх дзяржаваў у разбраеньні, роўнасьці і волі Нямеччыны,—як сябры Лігі Нацыяў, чаму несьцярпіма супярэчыць усьцяж існуючая акупацыя нямецкай зямлі саюзьнікамі. У сваей прамове Мюллер ня стрымаўся і даў сьцяг палямічных удараў па Брыяну, якому, паміж іншым, выхваляючы яго знамянітае красамоўства, дэлікатна закідаў, што яго пекныя словы неяк не заўсёды цягнуць уровень з сабой цалком адказваючыя ім чыны... Відаць, гэтыя палямічныя закіды павадыра нямецкай дэлегацыі яшчэ больш запалілі палямічным агнем Брыяна, які, што называецца, „даў дыхту“ немцам...

У канцы прамовы Брыян зьвярнуўся да справы меншасьцяў, у якой — ведама-ж — падтрымаў пагляды мін. Залескага. „Лёс меншасьцяў, казаў Брыян, перад вайной быў горшы (?), як па вайне. Іх голас аб помачы ня быў навет чуты. Цяпер-жа Ліга Нацыяў, запраўды-ж як родная матка меншасьцяў, бярэ іх усіх пад сваю ахову (?). Але ж, мае-ж вы паны, матка не павінна псаваць дзяцей залішняй аховай,—балаваць іх, казаў Брыян. Гэта трэба рабіць асьцярожна,—навет з „найвялікшай асьцярожнасьцяй“... „Меншасьцяў (як дзяцей!...) не павінна дапускаць да выступленьня (з скаргамі?!) проці дзяржаваў, у якіх яны жывуць, — бо інакш — мір быў-бы заўсёды пад паважнай пагрозай“. Не дапускаць скаргаў—галасу—гэта-ж пэўне—для таго, каб гэты „голас меншасьцяў быў слышней па вайне“, як да вайны! Так казаў шляхотны „пацыфіст“ і „гуманіст“ у Лізе Нацыяў—не саромячыся сваіх слоў, — перад цэлым сьветам!

Прамова Брыяна, як сказана, выклікала страшэннае, даўно нябывалае абурэньне ў ва ўсей Нямеччыне.

Уся бэрлінская прэса зразумела прамову Брыяна, як адказ на дамаганьні, выражаныя ў прамове Мюллера. Брыян сядзеў як раз насупроць нямецкай дэлегацыі і, кажучы, зьвяртаўся проста да Мюллера. Уся прамова, кажа нямецкая прэса, скіравана па сутнасьці выразна проці Нямеччыны, калі ня лічыць аднаго выпаду проці СССР. Брыян рэзка высьмяяў пацыфістычныя заклікі да агульнага разбраеньня, з якімі зьвяртаўся да Лігі канцлер-сацыяліст Мюллер, назваўшы іх—„разбраенчай маніфэстацыяй, ня сумернай павазе адказнага дзяржаўніка“... Навет нямецкая нацыяналістычная прэса называе гэтыя выпады Брыяна „асабістай абразай і бясстыдным нападам на асобу нямецкага канцлера“...

Па—сутнасьці-ж нямецкая прэса слушна бачыць у прамове Брыяна катэгарычную адмову канцлеру Мюллеру на ўсе яго яўныя дамаганьні і сэкрэтныя перагаворы — ў справе скасаваньня акупацыі. Страшэнна абураецца нямецкая прэса, што Брыян закідае Нямеччыне, як пагрозу вайны з яе боку, навет тое, што нямецкі народ нячувана хутка адбудаваў свае гаспадарчае жыцьце, сваю прамысловасьць, свой гандлёвы флёт і г. д. „Апошняя прамова Брыяна, кажуць газэты, на гэты раз не складалася з гучных і пекных фразаў, як заўсёды, калі ён кажа „пацыфічныя“ прамовы... Не, на гэты раз каждае яго слова, гэта—чын, гэта ўдар молата, разьбіваючы ў груз усю будову француска-нямецкага паразуменьня“... Гэта прамова разьбіла адным махам усе, што было збудавана за апошнія гады...

Адна з найвялікшых дэмакратычных газэтаў Нямеччыны піша, што прамова Брыяна—вялікае расчараваньне для Нямеччыны, што яна пахавала канчальна ўсе былыя сымпатыі для Брыяна ў нямецкім народзе. Цэнтровая „Германія“ піша, што за апошнія 5 гадоў ня было чуваць вастрэйшага процінямецкага голасу ў-ва Францыі, як гэта прамова „прыяцеля Нямеччыны“ Брыяна...

Ведамы дэмакратычны публіцыст Бэрнгардт называе прамову Брыяна „гусарскай атакай“—не дастойнай—ані Брыяна, ані Лёкарна, называе яе—„не палітычнай, але нэрвовай“. Ён кажа, што гэтая прамова магла-б зламаць карак кожнаму ўраду ў Нямеччыне, які меў-б менш сільныя падставы ў парляманьце Нямеччыны, чым яе сучасны ўрад. Гэтая прамова страшэнна ўтрудніць далейшую паправу стасункаў паміж Францыяй і Нямеччынай, ад якіх, як не аднойчы заяўляў сам Брыян, залежыць мір у Эўропе... Так ацэніваюць „пацыфістычную“ прамову Брыяна ў Нямеччыне.

Тэлеграма кажа, што зараз-жа пасьля прамовы Брыяна сабралася на нараду нямецкая дэлегацыя. Віцэ-міністар Шубэрт меў гутарку з Брыянам. Нямецкая дэлегацыя мае апрацаваць адказ на прамову Брыяна, з якім канцлер Мюллер мае выступіць на гэтым тыдні.

Трэба думаць, што ў значнай меры пад уплывам размовы з Шубэртам — Брыян на другі дзень пасьля сваей прамовы — ў спэцыяльнай гутарцы з журналістамі—высьвятліў—„запраўдны зьмест сваей прамовы, якая зусім ня была скіравана проці Нямеччыны“.— Адносіны да Нямеччыны асталіся такімі-ж, як былі“... Кажучы аб ваенных магчымасьцях Нямеччыны, Брыян „зусім не закідаў Нямеччыне падрыхтаваньня вайны“... „Наадварот—Брыян верыць у мірныя намеры нямецкага ўраду“ і г. д. Быццам гэтыя „высьвятленьні“ значна залагодзілі настроі, пануючыя сярод нямецкай дэлегацыі...

Апошнія падзеі у Латвіі.

Сярод прыбалтыцкіх нова-паўстаўшых дзяржаў Латвія дасюль была амаль ня самай дэмакратычнай рэспублікай: захавала свабоду сабраньняў, арганізацыі, культурнага і нацыянальнага жыцьця меншасьцяў. Але, відаць, „пасьпехі“ і „эвалюцыя“ (ведама ў які бок) яе суседкаў заразілі і цяперашні латвійскі ўрад Юрашэўскага і ён рашуча пайшоў за іх прыкладам і тактыкай — прыняўся душыць сялянска-работніцкія радыкальныя арганізацыі. Асабліва абурыла ўрад справа, апублікаваная перад народам лявіцовымі групамі, што міністры ўзялі ад швэдзкай сэрнікавай супалкі 50 тысяч карон „хабару“, вядома-ж, пазваляючы за гэта эксплятаваць бескантрольна работніка і народную маемасьць—лясы. Асабліва ўзяліся на Цэнтральнае Бюро Прафэсіянальных Саюзаў, пусьцілі ў прэсе, быццам яно атрымала з СССР 10 тысяч фунтаў стэрлінгаў, паднялі цэлую кампанію, траўлю. Буржуазныя пісакі ажна пеніліся: камуністы, здраднікі, агенты і г. д. Адным словам, жыўцом схапілі практыкаваныя суседкамі мэтоды! І вось у прошлым месяцы распараджэньнем міністра ўнутраных спраў Цэнтральнае Бюро зачынілі, а сяброў укінулі ў вастрог. Гэта распараджэньне супярэчыла з латвійскай канстытуцыяй, паводле якой міністар мог толькі часова прыпыніць яго дзейнасьць, а зачыніць можа толькі суд, але ж канстытуцыя для маючага ў сваіх руках уладу, відаць, нічога ня значыць. Выконваецца яна заўсёды датуль, пакуль не стаіць на перашкодзе ўраду, ці клясе грамадзянства ўрадавай партыі дапяць якой-небудзь мэты, або пакуль усё ціха гладка: баўцеся, маўляў, цешцеся сабе працоўныя прыгожай „дэмакратычнай“ канстытуцыяй! Але, калі яна стаіць на перашкодзе і, як у даным выпадку, не пазваляе зачыніць „камунізуёнцы“ прафсаюз, дык тады далоў, на бок канстытуцыю!

Але і суд, вядома-ж, ня стаў у абароне зачыненай арганізацыі і моўчкі згадзіўся на гэта. Па ўсёй Латвіі ад работніцтва пасыпаліся пратэсты проціў такога гвалту над іх цэнтральнай установай, але ўрад не зьвярнуў на гэта ўвагі і на 21-га жніўня назначылі суд над сябрамі Цэнтральнага Бюра.

Тагды партыя Незалежных Сацыялістаў прызвала работнікаў да больш актыўнай барацьбы і больш рашучага пратэсту і выдала адозву з заклікам да аднадзеннай забастоўкі на дзень судовай расправы, 22 жніўня.

Перад гмахам акружнага суда ў Рызе сабраўся ў гэты дзень натоўп работнікаў, заатакавалі суд, стараліся прарвацца ў памяшчэньне суда, дамагаючыся звальненьня сваіх кіраўнікоў. Падзеі пачыналі прыймаць грозны від так, што аж паліцыя змушана была адкрыць агонь па безбаронных. Кроў працоўных абмыла брук Рыгі. Забастоўка цалком ня была праведзена, дзякуючы здрадзе латвійскіх сацыял-дэмакратаў, якія ў газэтах нібы абураліся на ўрад, але, калі дайшло да сапраўднай абароны—збайкатавалі яе і да забастоўкі не далучыліся. Ня глядзячы на здраду сацыял-угоднікаў, усё-ж такі больш, як трэцця частка работнікаў пакінула варштаты працы. Галосным рэхам пракацілася хваля пратэстаў і на правінцыі. У Дынабургу ўжо 21-га жніўня раздавалі праклямацыі з заклікам да забастоўкі-пратэсту, 22-га жніўня адбылася дэманстрацыя, аб разьмерах і падробнасьцях якой мала піша польская прэса, але падае, што ўвечары была ўведзена на вуліцы места войска, значыць, паліцыя сама не магла даць рады дэманстрантам.

Суд быў змушаны перарваць паседжаньне і адлажыць разгляд гэтай справы і пэўне-ж свой суровы прысуд над павадырамі на другі, больш адпаведны час. У самай Рызе арыштавана ў зьвязку з дэманстрацыямі каля 500 чал., у Дынабургу 30, з іншых местаў вестак няма. Пасьля гэтых „разрухаў“ урад зараз-жа аб'явіў нелегальнай і партыю Незалежных Сацыялістаў, ачысьціў дарогу Сацыял Дэмакратам, якія цяпер, у зьвязку з хутка маючымі адбыцца выбарамі ў Сойм, прыймаюць на сябе ролю абаронцаў працоўных і перамалёўваюць свае штандары на больш радыкальную ахварбоўку. Каб адцягнуць увагу работніцкіх масаў ад рашучай барацьбы і адначасна ўтрымаць на сваім павадку, яны сыплюць направа і налева радыкальныя заклікі, якія зьяўляюцца ў руках сацыял-дэмакратаў толькі пустымі гукамі. У рашучы момант яны заўсёды здраджаюць і пойдуць на ўгоду з буржуазіяй. Гэта добра ве-

дама для латвійскага ўраду і таму ім пазваляюць „пабавіцца“ ў барацьбітаў... языкамі.

Але-ж яны выдалі сябе з галавой, паказалі ўжо сваё запраўднае абліччa падчас аднадзённай забастоўкі, дык атуманіць сваіх работнікаў будзе вельмі трудная задача.

Тым больш, што гаспадарчая сітуацыя Латвіі, гэта маткa ўсялякіх рэвалюцыяў, вельмі няцікавая: латгальцы, занядбаныя ўрадам, церпяць нэндзу і голад, у местах усьцяж павялічваецца беспрацоўе, парты і камунікацыйныя шляхі замёрлі. Рыжскі і Лібаўскі порт будаваліся і былі дапасаваныя да патрэбаў вялізарнага расейскага гаспадарства, а цяпер, калі Латвія, маленькі куточак, адгарадзілася кардонамі і жыве сваім самастойным маленькім жыцьцём, дык інакшай і быць ня можа. Праўда, ССРР значную частку свайго імпорту і экспорту правозіць праз Латвію, але большую часьць кіруе праз Ленінград, дзе не патрабуе плаціць ніякіх мытаў.

Эканамічнае становішча пагаршаецца і гэтага ня здолее папpавіць латвійскі буржуазны ўрад навет у хаўрусе з сацыял-дэмакратамі, а таму работніцкія масы змушаны шукаць выхаду са створыўшагася палажэньня, з гэтага тупіка, паміма іх і знахадзіць сваю уласную дарогу, адкідаючы са сваёй пуцявіны ўсялякія перашкоды.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Акульнік міністра скарбу.

Міністар скарбу выдаў акульнік да мытных урадаў, у якім прыказвае „тактоўна“ вясьці сябе з падарожнымі і асабліва прыяжджаючымі з заграніцы, не настаўляцца сваёй службовасьцяй і ў выпадку толькі крайняй патрэбы рабіць асабістыя рэвізіі і то хутка і, магчыма, дэлікатней, каб не абражаць брутальнымі спосабамі заграничных гасьцей. Акульнік прыказвае абсадзіць галоўныя міжнародныя шляхі больш інтэлігентнымі ўрадоўцамі.

Відаць, дасюль было зашмат гэтых брутальнасьцяў, надстаўленьняў і замала інтэлігенцыі і дэлікатнасьці, што аж патрабавалася выдаць спэцыяльны акульнік!

Нядаўна на пагранічччы добра патрасьлі самога пана міністра, ну а, ведама-ж, навука на сваёй уласнай скуры бывае карысна і для агульнай справы.

Ізноў Венява-Длугашэўскі перад судом.

Як падае газэта „Глос Праўды“ (№ 249), у пятніцу 7-га г. м. на лаве абвінавачаных Варшаўскага Акружнога Суду апыніўся, зрэшта ня першы і пэўне яшчэ не астатні раз, ведамы радыкальны публіцыст, рэдактар-выдавец тыднёвіка „Polska Wolność“, Тадэуш Венява-Длугашэўскі. Абвінавачваўся ён у тым, што ў 1926 годзе ў выдаваным праз яго тыднёвіку „Polska Wolność“ зьмясьціў артыкул, у якім прызываў злучыцца палітычныя групы, стоячыя налева ад пэпээсаўцаў, заклікаў работнікаў да „ўбоёвеня“ (гатоўнасьці да барацьбы), гаварыў аб патрэбе ўсіленай барацьбы з буржуазіяй і супольнага сялянска-работніцкага змаганьня за лепшую будучыню. Пракурор угледзіў у гэтым артыкуле прызыў да камунізму, падбураньне аднэй клясы грамадзянства на другую і, ведама-ж, падвёў пад рубрыку „працы антыпанствовай“, паводле якога гразіла-б Длугашэўскаму шэсьць гадоў вастрогу.

Абаронца Бэрэнсон зьбіў гэтыя закіды, высьвяляючы, што заклік да „ўбоёвеня“ ня ёсьць яшчэ заклікам да крывавай барацьбы, а толькі да барацьбы за належныя для сябе правы, што робіць навет самы правы саюз і навет самі судзьдзі і пракуроры. Барацьба з буржуазіяй і імкненьне да вольнасьці ёсьць легальны прывілей кожнай партыі і кожнага чалавека на ўсім сьвеце — гаварыў адвакат.

Суд пасьля доўгай нарады ўсё-ж такі прызнаў Длугашэўскага ня віноўным у камунізьме, абвінавачваючы толькі за падбураньне, але, застасаваўшы амністыю — скасаваў гэту справу. Дзіўна. Хоць і „комунізуёнцы“, але ўсё-ж свая кроў трохі сказалася!

Засыпаныя гарнякі.

У капальні „Клеафас“, каля Катавіцаў, засыпана зямлёй 5 работнікаў.

Двох выратавалі яшчэ жывых і адправілі ў шпіталь, двох выцягнулі ўжо пакойнікамі, а аднаго зусім не знайшлі.

Як, відаць з гэтага, дык ня толькі рэвалюцыі, розныя войны вымагаюць ад людзей ахвяр, але-ж таксама і вызыск капіталістычны забірае сваё.

Зьезд польскіх манархістаў.

У нядзелю адбыўся ў Варшаве агульнапольскі зьезд манархістычнай арганізацыі. Прысутных сабралася каля тысячы чалавек. Была ўхвалена рэзалюцыя, у якой манархісты захопліваюцца дасягненьнямі сучаснага ўраду і выражаюць яму поўнае даверые і абяцаюць сваё падтрыманьне.

А чаго-ж ім больш трэба?

Заграніцай.

Урачыстае спатканьне польскай прамысловай дэлегацыі ў Маскве.

У Маскву прыбыла дэлегацыя польскіх прамысловцаў, у чэсьць якой у Маскве быў наладжаны ўрачысты банкет. У банкеце прымалі ўчасьце—польскі пасол у Маскве Патэк з сябрамі пасольства, старшыня Усе-саюзнай Заходняй Гандлёвай Палаты Аралаў, старшыня камітэту Ніжагародзкага кірмашу Малышоў, прэзыдыум Маскоўскага біржавога камітэту, прадстаўнікі камісарыяту гандлю і прамысловасьці і каміс. заграничных спраў.

На банкеце старшыня Малышоў і навадыр польскай дэлегацыі п. Любемірскі сказалі мовы, у якіх падчырківалі важнасьць гаспадарчага супрацоўніцтва Радаў з Польшчай.

З Масквы польская дэлегацыя выехала ў Ніжні-Ноўгарад—на кірмаш.

„Известия“ вітаюць прыезд польскіх прамысловцаў у ССРР

З прычыны прыезду дэлегацыі польскіх прамысловцаў у ССРР „Известия“ зьмяшчаюць артыкул, у якім кажуць, што польская дэлегацыя можа спадзявацца самага сэрдэчнага прыняцьця ў ССРР. Радавая газэта выражае надзею, што прыезд польскіх прамысловых дзеячоў будзе вельмі карысны і для стасункаў паміж абодвума краямі наагул, асабліва-ж — стасункаў гандлёвых. Газэта прапануе польскаму ўраду безадкладна ўзяць на сябе пачын у справе праўнага ўрэгуляваньня гэтых стасункаў.

Польска-літоўскі спор у Лізе Нацыяў.

Польска-літоўскаму канфлікту Ліга Нацыяў ізноў ахвяравала шмат часу. Мы ня будзем падрабязна перадаваць ходу распрavы ў гэтай справе ў Радзе Лігі, падамо толькі яе пастанову. Ад'значым перадусім, што Вальдэмарас залішне доўга ды падрабязна палямізаваў з Польшчай, значна замарыўшы слухачоў. Навет прыхільныя да літоўскай справы нямецкія газэты пішуць, быццам у канцы 2 х гадз. прамовы Вальдэмараса некаторыя сябры Рады Лігі—паснулі! Бо-ж трэба прыняць пад увагу, што разам з тлумачэньнямі ўся прамова Вальдэмараса зацягнулася аж на 4 гадзіны! Пасьля палемікі між старонамі і кароткіх увагаў з боку некаторых сяброў Рады — дакладчык, галяндзкі дэлегат Бэлаэртс, запрапанаваў Радзе „рапарт“, які і быў прыняты аднагалосна. Згадзіліся на рапарт і абедзьве спорчыя староны. Рапарт, сцьвярдзіўшы непасьпех дасюляшніх перагавораў, прапануе з націскам абедзьвюм старонам, каб чым хутчэй дайшлі да паразуменьня. Адначасна рапарт Рады прадбачыць—у разе далейшага непасьпеху перагавораў — стварэньне камісіі экспэртаў (рэчазнаўцаў), якая мела-б разглядзець, у чым труднасьць паразуменьня паміж абодвума краямі. Адзін з рэчазнаўцаў гэтай камісіі экспэртаў мае быць прысутным на польска-літоўскіх перагаворах у якасьці наглядчыка, каб пасьля камісія мела ад яго поўнае паняцьце аб характары перашкодаў на шляху паразуменьня. Такім чынам далейшыя перагаворы маюць адбывацца ў пэўнай меры „пад наглядам Лігі“.

Як ведама, Вальдэмарас яшчэ раней дамагаўся ад Рады назначэньня наглядчыка, і „пасрэдніка“ пры перагаворах. Брыян, узяўшы голас, выразіў гарачае пажаданьне, каб урэшце паміж Польшчай і Літвой дайшло да паразуменьня: было-б вельмі балюча для ўсіх, калі-б Лізе не ўдалося ўхіліць канфлікту. Пасьля гэтага Рада прыняла аднагалосна рапарт, пастанавіўшы аднак-жа паставіць ізноў усю справу на павестцы першага паседжаньня новастворанай Рады— пасьля новых выбараў. Гэта — дзеля таго, каб перадусім выбраць новага дакладчыка — на мейсца Бэлаэртса, бо-ж Галяндыя траціць на наступнае трохлецьце сваё мейсца ў Радзе Лігі.

Калі пачнуцца ізноў перагаворы.

Зараз-жа пасьля паседжаньня Рады адбылося спатканьне Залескага з Вальдэмарасам — у справе прадаўжэньня перагавораў. Залескі націскаў, каб Вальдэмарас зараз-жа назначыў тэрмін польска-літоўскай канфэрэнцыі, згары згаджаючыся на кожны, абы толькі—чым хутчэйшы. Але Вальдэмарас, як цьвердзіць „ПАТ“, стараючыся ўхіліцца ад точнага адказу, сьпярша казаў, што павінен зараз-жа выехаць дамоў, дык даручае паразуменьне ў справе гэтай паслу Сідзікаўскасу, але—пасьля пад націскам Залескага—запрапанаваў 3-га лістапада ў Кэнігсбэргу сабрацца пленуму канфэрэнцыі. У Жэнэве гэта выклікала ўражаньне, быццам Вальдэмарас умысна цягне справу.

„Літва жадае міру, але—яшчэ больш—справядлівасьці“.

На ўрачыстым акце ў ваеннай школе літоўскі прэзыдэнт Сьметона, раздаючы скончыўшым афіцэрскія дыплёмы, сказаў прамову, у якой, паміж іншым, заявіў, што—Літва можа шчыра сказаць у Лізе Нацыяў, што зьяўляецца прыхільніцай міру. Але яшчэ больш чым міру, жадае Літва справядлівасьці. Літва ніколі не зрачэцца тых зямель, якія да яе належаць. Незалежнасьць Літвы будзе загарантавана толькі тады, калі яе сталіцай ізноў стане Вільня.

Нямецка-польскія гандлёвыя перагаворы.

Нямецкая дэлегацыя ў справе заключэньня гандлёвага трактату з Польшчай 9 га верасьня мела выехаць у Варшаву.

Нямецкія скаргі на Польшчу ў Лізе Нацыяў.

Рада Лігі, паміж іншым, ізноў разглядала скаргу нямецкіх арганізацыяў на Польскім Шлёнску. Скарга была, відаць, прызнана Радай маючай пэўныя падставы, бо ў рэзалюцыі Рада, — „прымаючы да ведама высьвятленьні польскага ўраду, выражае перакананьне, што распачатае сьледзтва выкрые вінаватых, якія будуць укараны“. Сам польскі ўрад сцьвярдзіў, што—„некалькі дзесяткаў у нямецкай скарзе фактаў нарушэньня законаў прыведзены слушна, але што — на час 1922—1928 г.г. гэта — вельмі малы процант нарушэньня закону“... Дэлегат Галяндыі Бэлаэртс запрапанаваў падчыркнуць у рэзалюцыі, каб польскі ўрад прыняў пад увагу тое, што Рада Лігі зьвяртаецца да яго ў гэтай справе. На гэта мін. Залескі, відаць, балюча зачэплены, адказаў востра, што польскі ўрад і без асаблівага націску з боку пана галяндзкага дэлегата споўніць свой абавязак.

(„Тэлегр. Кур. Варш.“).

Узмацненьне клерыкалізму.

Польская буржуазія пакладае асаблівую ўвагу на ўзмацненьне сярод працоўных масаў клерыкалізму з мэтай падпарадкаваньня іх і ўмажлівеньня праз гэта правядзеньня часьцёвай стабілізацыі капіталізму, коштам нэндзы і голаду сялян і работнікаў. Ступіць вострасьць клясавага змаганьня, зьнішчыць дух барацьбы за палепшаньне свайго быту і аканчальнага вызваленьня з-пад ярма капіталізму—вось галоўнае заданьне клерыкалізму, угодовых, нібы сялянска-работніцкіх партыяў, як ППС, НПР (Narodowa Partja Robotnicza), Вызваленьне, Сялянскі Саюз і інш.

Поруч з нарастаньнем эканамічнай і палітычнай барацьбы працоўных масаў вёскі і места, выкліканай што-раз больш пасіленым капіталістычным вызыскам, узрастае дзеяльнасьць клеру (духавенства) розных рэлігіяў і сацыял-здрадніцкіх партыяў, каб стлуміць кожную ад'знаку барацьбы, а калі апошняя ўзьнікае проці іх волі — здрадзіць і ганебна запрадаць сялян і работнікаў, даючы гэтым капіталістам і абшарнікам магчымасьць апанаваць сітуацыю.

Зусім даволі будзе гэтага на практыцы апошніх дзён беларускага жыцьця, дзе клерыкалізм і ўгода імкнецца да апанаваньня кожнага закутку грамадзкага жыцьця.

На Мітрапалітальным Зьезьдзе, у імя Зах. Беларусі былі вядомы „айцец“ А. Коўш, а з ім пара ранейшых грамадоўцаў, выказваючы тут масам сваё праўдзівае абліччa.

Пэўна-ж, гэтыя дзеячы спадзяюцца на бліск сваіх іменьняў і не падазраваюць, як груба мыляцца яны, думаючы, прыкрываючыся плашчыкам дзеячоў старой Грамады, ідэалёгія якое глыбока ўвайшла ў умыслы працуючых масаў, што ўдасца ім атуманіць іх і зьвясьці з выпрабаванай дарогі барацьбы.

Наша хроніка.

Кафэдра беларусазнаўства ў... Варшаўскім унівэрсытэце. Сэнат Варшаўскага ўнівэрсытэту пастанавіў у сёлетнім годзе адчыніць кафэдру беларусазнаўства пры Тэолёгічным Аддзеле Варшаўскага ўнівэрсытэту, у якім вучацца пераважна матурысты праваслаўнай духоўнай сэмінарыі. На „прафэсара“ ў гэты аддзел прынята кандыдатура ведамага для белар. грамадзянства „дзеяча“ — Янкі Станкевіча. Толькі вось няведама, хто запрапанаваў яго кандыдатуру Сэнату Варшаўскага ўнівэрсытэту? Хто выдаў аб ім такую добрую „апінію“? І чаму гэта не адкрываюць кафэдры беларусазнаўства пры Віленскім унівэрсытэце, у сэрцы Заходняе Беларусі, аб чым так многа гаварылі і што так гучна дэкляравалі нашы „рэгіяналісты“?

Заканчэньне паўночнага кірмашу. Нядзеля 9. IX.—28 г. была апошнім днём паўночнага кірмашу. „Панствовы Банк Рольны“ распрадаваў з ліцытацыі завадзкіх каней, кароў, сьвіней, якіх раскуплялі сэймікі, плацячы досыць салідныя цэны.

Энэргічная праца „адзінкі“. У Лідзе нядаўна адбылося пасольскае справаздаўчае сабраньне, наладжанае ядынкарамі, на якім, як піша „Кур'ер Віленскі“, было шмат „рольнікаў“.

Пасол Камінскі паінфармаваў прысутных аб зьмене канстытуцыі і сказаў, што пасьля гэткага „чыну“ Сойм займецца палючымі патрэбамі сялянства, правядзеньнем камасацыі (вось зробяць палёгку для сялянства!), эксплёатацыяй лясоў (якія ўжо амаль ня ў пень высечаны) і адбудовай на „земях усходніх“.—Паслы беспарт. блеку—казаў — ужо прыгатавалі ў гэтай справе ўнёскі да ўраду.

Мусіць, так і гэтыя „ўнёскі“ падзеюць, як у справе бел. школьніцтва ўхвалілі і школы адчыніць, і запамогі даць і тое і сёе, але аб гэтым нешта ані слуху, ані духу, затое ў Радашковічах (ў Гімназіі) і ў Галоўнай Управе Т-ва Бел. Шк. ў Вільні, палёгку“ далі.

— Дробныя „рольніцы“ — піша далей „Кур'ер“ — слухалі прамову Камінскага „з аграмадным заінтэрасаваньнем“.

Відаць, гэта „аграмаднае заінтэрасаваньне“ дадало энэргіі панкам з адзінкі і яны агалашаюць, што такія-ж сабраньні адбудуцца ў Слоніме, Баранавічах і Валожыне. Дык пастарайцеся, сяляне, абавязкава быць на іх, а то інача можаце і не атрымаць камасацыі, парцэляцыі, асаднічкаў і іншых „бэбэхоўскіх“ фокусаў!

Дэфраўдацыі ў віленскай дырэкцыі каляёвай. Як падае „Слово“, нядаўна здарыліся ізноў два выпадкі „дэфраўдацыі“—адзін у Горадні, дзе скарбнік Клінка захапіў 30 тысячаў зл., і другі ў беластоцкай паддырэкцыі, дзе таксама скарбнік Гілеўскі захапіў 10 тыс. зл. і, замкнуўшы акуратна касу, скрыўся „ў невядомым кірунку“.

За імі пэўне-ж „зажондзоны посьціг“, толькі сумліўна, ці ўдасца злавіць гэтых „птушак“! Ці выкажа тут сваю „спрэнжыстасьць“ паліцыя, паглядзім!

З жыцьця С. С. Р. Р.

Урачыстасьці сотых угодкаў сьмерці Льва Талстога.

У гэтым годзе Радавы Саюз урачыста сьвяткуе сотыя ўгодкі сьмерці Льва Талстога, аднаго з тварцоў расейскае рэвалюцыі. Абход будзе прадаўжацца ў працягу 7 дзён.

10-га гэтага верасьня ў гмаху опэры наступіла ўрачыстае распачацьцё талстоўскага тыдня. Камісар асьветы Луначарскі прачытаў рэфэрат. Дня 11 верасьня ў музэі штук пекных адчынена выстава памятак аб Талстым. Дзеля гэтага сабраныя ўсе партрэты Талстога, у розных эпохах яго жыцьця. Гэтага ж самага дня ў розных клюбах і тэатрах адбыліся прадстаўленьні пад знакам Талстога. 12 верасьня асобым цягнікам сябры камітэту, а так-жа запрошаныя госьці, паедуць у Ясную Паляну. У апошнія дні тыдня адбудзецца цэлы сьцяг навуковых паседжаньняў, літэратурных лекцыяў і акадэміяў, эпілёгам якога будзе ўрачысты вакальна-музыкальны вечар у салі маскоўскай кансэрваторыі, пры ўдзеле выдатных артыстычных сілаў.

Апрача таго, з іншых дзяржаў маюць прыехаць каля дваццацёх выдатных навуковых сілаў, дзеля прыйманьня ўдзелу ў урачыстасьцях.

Горкі цяжка хворы.

Адзін з найбольшых пралетарскіх пісьменьнікаў, Максім Горкі, які сваімі творамі хіба найбольш узбагаціў пралетарскую літэратуру, цяпер цяжка захварэў. Ляжыць ён у Маскоўскай санаторыі, дзе за ім дагледаюць лепшыя дахтары.

Колькі ўсяго камуністаў?

На гэтае цікавае пытаньне дае адказ № 209 „Słowa“, дзе чытаем:

„Скончаныя нядаўна нарады Кангрэсу Комінтэрну ў Маскве, якія цягнуліся некалькі тыдняў, даюць абраз, як мэты камуністаў, такі і іх сілы. Пад тым узглядам заслугоўвае на ўвагу справаздача мандатнай камісіі Кангрэсу.

На кангрэс былі запрошаны 66 партый і арганізацый, якія рэпрэзантавалі агулам — 4.024.159 сяброў. На камуністычныя партыі ці арганізацыі, якія ўваходзяць у склад камуністычнага інтэрнацыяналу, выпадае — 1.798.859, рэшту ў ліку 2.225.800 становяць сябры камуністычнага саюзу моладзі (камсамолу). У ліку 1.798.859 сяброў камуністычнай партыі расейская камуністычная партыя займае першае мейсца, налічае яна 1.210.054 сябры, рэшта 583.105 выпадае на іншыя дзяржавы“.

Мільён новых навабранцаў.

„Słowo“ № 204 падае:

„У радавай Расеі пачаўся ў гэтых днях набор навабранцаў. Маскоўскія „Ізвестия“ ў зьвязку з гэтым зазначаюць, што больш 1.000.000 маладых работнікаў і сялян прайдзе цераз пабаровыя камісіі“.

„Набор навабранцаў у радавай Расеі апіраецца на клясавай падставе. У чырвонай арміі могуць служыць у характары рэгулярных жаўнэроў толькі асобы пралетарскага паходжаньня“.

„Для непрацуючых элемэнтаў,—пішуць далей „Ізвестия“, няма і ня можа быць мейсца ў радох арміі пралетарскай дыктатуры. Ня гледзячы, аднак, на гэта, у рады чырвонай арміі пралазілі да гэтага часу элемэнты, варожыя працоўнай клясе. Да элемэнтаў гэтых залічыць трэба перадусім сыноў духаўнікоў, далей сыноў былых абшарнікаў, жандармаў, купцоў і ўсялякага роду вясковыя, кулацкія элемэнты і г. д. Гэтая частка, з пункту гледжаньня сацыяльнага паходжаньня, варожая рабочай клясе, усімі сіламі стараецца выкарыстаць сваю ўмысловую пераваґу з мэтай шырэньня раскладу ў чырвонай арміі“.

Работніцкія манэўры ў Ленінградзе.

Ад 10-га г. м. у Ленінградзе пачнуцца г. зв. работніцкія манэўры, у якіх прыймуць удзел работніцкія арганізацыі. Заданьнем манэўраў будзе абарона Ленінграду ад атакі флёту.

Як бачым, бальшавікі рэалізуюць думку К. Маркса, які казаў, што пры дыктатуры пралетарыяту трэба ўзброіць працоўныя масы, каб абараніцца ад вонкавага нападу і ўнутранай контррэвалюцыі.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерко.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.